рубеже веков. Это своеобразный хэппенинг, в котором никогда не знаешь заранее, что произойдет в следующий момент вместо живой жизни.

Живописная поэтика становится все более отточенной, простой и естественной. Окружающая нас действительность стремительно меняется, все больше изменяет свое лицо и природа под слоем индустриальной косметики. Нас все больше окружает искусственное. Стремление походить друг на друга, следовать моде, разрушение природной, естественной окружающей среды нивелируют людей и культуру. На холстах глаза ищут совсем другого — того, что всплывает из дальних, потаенных уголков нашей памяти.

Естественно, что в предложенных вниманию читателя заметках не нашли отражения все те проявления, которыми так богата живопись Беларуси на рубеже XX—XXI в. Главное — это ее многообразие, что открывает новые возможности для дальнейшего движения вперед. В нынешних условиях наступления массовой культуры важно удержаться в водовороте вульгаризации истинных ценностей, сохранить накопленный в прошлом профессионализм, не утратить его в погоне за миражами «современного стиля».

**Zhuk V. I.**

*OIL-PAINTING OF BELARUS IN THE NEW MILLENIUM*

*The artists' imaginations seeks for an adequate expression in multiaspect and varied art material, in their works there are certain features of the past, perception of the present and forseeing of the future. The main feature of contemporary Belarusian painting is its diversity, which gives new possibilities for further development. In the present conditions of mass culture expansion it is important to stay alive in the whirlwind of profanation of true values, preserve the traditions of professionalism in the chase of the mirages of 'modem style'.*

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА Ў СУЧАСНЫМ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫМ ПРАЦЭСЕ БЕЛАРУСІ

**Ігнатовіч П. Р.,**
**кандыдат гістарычных навук, прафесар; прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Адной з фундаментальных задач беларускай культуры з'яўляецца фарміраванне грамадскай думкі ў напрамку ўсведамлення значнасці традыцыйнай мастацкай культуры як архетыпічнай субстанцыянальнай сферы чалавечай духоўнасці нацыянальнага менталітэту, як асновы развіцця прафесійнай культуры. Гэта задача ў нашай дзяржаве набывае тым большую актуальнасць, што ў кантэксце сусветных этнакультурных працэсаў менавіта беларуская традыцыйная культура мае асаблівую гісторыка-культурную каштоўнасць, паколькі да сённяшняга дня захоўвае сістэмную цэласнасць і аўтэнтычнасць праяў жывой мастацкай культуры вуснага тыпу [6, 5].

Народная культура — найважнейшая частка нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Яна адыгрывае выключную ролю ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні беларусаў як этнасу, адлюстроўваючы яго гістарычныя вытокі і першародную сутнасць. Народ заўсёды выступаў сапраўдным творцам і носьбітам самабытных этнакультурных традыцый, якія ён беражліва захоўваў і клапатліва развіваў, перадаючы як сакральны дар у спадчыну сваім нашчадкам. Складваючыся з цягам часу ў зладжаную і гарманічную сістэму жыццёвых правіл, маральных норм, прыярытэтаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў, міфалагічных і мастацкіх вобразаў, працоўных навыкаў, народныя традыцыі служылі магутнай маральна-ахоўнай сілай і яго самабытнай культуры. Менавіта народная культура з уласцівымі ёй непасрэднасцю, першароднай чысцінёй, глыбокай маральнасцю, рэгіянальна-варыятыўнай разнастайнасцю ажыўляе розныя віды прафесійнага мастацтва, надае ім напеўторны нацыянальны каларыт і супрацьстаіць агрэсіі масавай, безыдэйнай і казённай культуры [4, 5].

Сэнс катэгорыі «народная культура» разглядаецца сучаснай культуралогіяй як зборнае паняцце, якое уключае культурныя пласты розных эпох ад глыбокай старажытнасці да нашых дзён. Фарміраванне і функцыяніраванне феномена «народная культура» ў этнічнай супольнасці або сацыяльных групах і супольнасцях living рознага тыпу звязана з усведамленнем іх прыналежнасці да народа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як магутны сродак аб'яднання народа і ўмацавання яго культурнай самастойнасці традыцыйная мастацкая культура ў лепшых яе здабытках павінна шырока распаўсюджвацца, каб садзейнічаць укараненню ў свядомасць самага шырокага кола нашых сучаснікаў у'яўлення аб ёй як аб надзвычай важнай частцы культурнай спадчыны чалавецтва, якая мае вялікае значэнне і ў яго гісторыі, і ў сучасным жыцці.

Вызначаючыся ўнутранай цэласнасцю, традыцыйная культура беларусаў, разам з тым, характарызуецца багаццем лакальных праяў, што робіць культурны ландшафт на тэрыторыі Беларусі неаднародным. Як вядома, тут вылучаецца шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Паазер'е, Усходняе і Заходняе Палессе, Панямонне, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, — і складаная сістэма традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў, такім чынам, глыбока, аб'ёмна, прадметна і пераканаўча можа быць раскрыта менавіта праз аналіз у тым ліку і рэгіянальных асаблівасцей развіцця.

Народная культура ў гістарычным мінулым у значнай ступені супадае з этнічнай, затым праяўляе выражаны сацыяльны, нацыянальны кампанент. Традыцыйная народная культура вызначае і нарміруе ўсе аспекты жыццядзейнасці супольнасці: уклад жыцця, формы гаспадарчай дзейнасці, рэгуляванне сацыяльных узаемаадносін членаў супольнасці, тып сям'і, выхаваннне дзяцей, характар жылля, тып адзення, харчавання, засваенне акружаючай прасторы, адносіны з прыродай, светам, паданні, вераванні, звычкі, абрады, павер'і, веды, мову, фальклор.

Усе гэтыя праявы народнай культуры вывучаюцца шырокім колам гуманітарных дысцыплін: этналогіяй, культурнай антрапалогіяй, фалькларыстыкай, этналінгвістыкай, мастацтвазнаўствам, гісторыяй культуры, іншымі культуралагічнымі дысцыплінамі.

Адна з важнейшых задач навукоўцаў заключаецца ў вычляненні некаторага інварыянтнага зместу, пранізваючага названыя кампаненты традыцыйнай культуры і маючага ў значнай ступені надэтнічны характар. Гэта, у прыватнасці, такія ідэі — каштоўнасці (цэннасці) — сэнсы, як прадстаўленні аб прыродзе, космасе, месцы чалавека ў свеце, рэлігійна-міфалагічным паняцці аб адносінах чалавека са звышнатуральнымі знешнімі сіламі, прадстаўленні аб ідэалах мудрасці, сіле гераізму, прыгажосці, дабра, аб формах сацыяльных паводзін, аб служэнні людзям, Радзіме і інш.

Улічваючы важнае значэнне развіцця народнай культуры, захавання і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны як важнейшага кампанента духоўнага жыцця народа за апошнія 15-20 гадоў, у нашай рэспубліцы сур'ёзная ўвага гэтаму пытанню надаецца не толькі дзеячамі культуры, навукоўцамі, але і дзяржавай. Сёння можна казаць аб стварэнні пэўнай прававой асновы па гэтай праблеме. Артыкул 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь канстатуе адказнасць дзяржавы за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у краіне. Прынцыпова важным з'яўляецца раздзел закона аб культуры, прысвечаны гісторыка-культурнай спадчыне. У 1992 г. быў прыняты спецыяльны закон «Об охране историко-культурного наследия», у 1998 г. у закон былі ўнесены значныя змяненні. Дапаўняе гэтыя заканадаўчыя акты вельмі важны закон «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь» (1999 г.).

Гэтымі дакументамі прадугледжана цэлая праграма, асноўнымі задачамі якой з'яўляюцца:

- арганізацыя адзінага дзяржаўнага ўліку каштоўнасцей, іх інвентарызацыі і ідэнтыфікацыі;
- удасканаленне парадку правядзення работ па рэстаўрацыі і зберажэнню, а дзеля гэтага стварэнне належнай эканамічнай базы аховы і рэстаўрацыі;
- удасканаленне практыкі фінансавання рэстаўрацыйных і кансервацыйных работ.

Натуральна, да гісторыка-культурнай спадчыны адносіцца вельмі вялікая колькасць матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей. Сёння пад дзяржаўнай аховай знаходзіцца 16 тысяч гісторыка-культурных каштоўнасцей. Аднак і сёння ў краіне налічваецца некалькі тысяч будынкаў, аднесеных да гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія лічацца бясхознымі [2, 19].

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны заканадаўча трактуецца як сістэма арганізацыйных, прававых і эканамічных мер па зберажэнню каштоўнасцей:

1) ад знішчэння або пагрозы знішчэння;
2) знікнення або пагрозы знікнення;
3) прычынення або пагрозы прычынення шкоды;
4) пагаршэння або пагрозы пагаршэння тэхнічнага стану;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5) навукова неабгрунтаваных змяненняў, уключаючы асяроддзе;

6) пагаршэння ўмоў утрымання.

На сучасным этапе агульнай асаблівасцю народнай культуры з'яўляецца яе пазапрафесійны, аматарскі статус у сферы сучаснай шматслойнай паліфанічнай культуры, неспецыялізаваны характар культурнай дзейнасці, што, аднак, не выключае высокага ўзроўню майстэрства, уменняў, ведаў, у аснове чаго ляжыць свабоднае валоданне традыцыяй.

У апошнія гады ў нашай краіне сфарміравалася тэндэнцыя росту зацікаўленасці маладога пакалення да вывучэння і адраджэння ўсяго комплекса традыцыйнай народнай культуры, гісторыка-культурнай спадчыны. Расце колькасць і папулярнасць фальклорна-этнаграфічных ансамбляў, якія з мэтай абагачэння рэпертуару, павышэння выканальніцкага майстэрства арганізоўваюць экспедыцыі, вывучаюць уклад жыцця, звычаі, збіраюць самабытныя песні, танцы, узоры народнага касцюма, вырабы народных промыслаў і прыкладной творчасці. Сведчаннем цікавасці да развіцця народнай творчасці служыць колькасны і якасны рост фальклорных калектываў.

Зварот да традыцыйнай культуры садзейнічае стварэнню аўтэнтычных фальклорных калектываў, узбагачэнню дзейнасці мастацкіх калектываў за кошт мясцовага, рэгіянальнага рэпертуару, пашырэнню палітры народных свят, фестываляў, фарміраванню арыгінальных рамёстваў. Гэтаму садзейнічала стварэнне новых форм устаноў культуры.

Пачынаючы з 1990-х гг. у краіне фарміруецца новая сістэма інфраструктуры ўстаноў культуры. Сярод новых устаноў — дамы (цэнтры) рамёстваў, дамы (цэнтры) фальклору, дамы (цэнтры) народнай творчасці і інш. Такая мера, безумоўна, спрыяла больш актыўнай прапагандзе і адраджэнню народнай творчасці.

У якасці прыкладу можна спаслацца на дзейнасць Лепельскага Дома рамёстваў, які з'яўляецца адной з першых устаноў новага тыпу не толькі на Віцебшчыне, але і ў рэспубліцы. Ён існуе з 1992 г. У яго фондах налічваецца больш за 250 экспанатаў, 115 карцін самадзейных мастакоў Лепельшчыны. З 1996 г. гэты Дом рамёстваў уключаны ў Еўрапейскую асацыяцыю фальклорных калектываў. Майстры народнай творчасці выязджалі з выстаўкамі ў Германію, Венгрыю, Галандыю, Чэхію, краіны Балтыі. У Доме рамёстваў вядзецца работа па 19 відах беларускіх рамёстваў. Сярод іх ткацтва, вышыўка, саломапляценне, лозапляценне, ткацтва паясоў, інкрустацыя і інш. У адпаведнасці з Праграмай «Культура», прынятай Віцебскім аблвыканкамам на 1999–2005 гг., частка калектываў рэарганізавана ў творчыя майстэрні, а Дом рамёстваў не толькі аб'ядноўвае майстроў-умельцаў, але і далучае да народнай творчасці дзяцей праз гурткі, майстар-класы [1, 125–126].

Заслугоўвае ўвагі дзейнасць раённага цэнтра рамёстваў Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці, што размешчаны ў г. п. Рось. Узначальвае ўстанову выпускніца БДУ культуры і мастацтваў, аспірантка-завочніца С. А. Кудаш. Цэнтр рамёстваў ажыццяўляе разнастайную дзейнасць па збору, захаванню і сістэматызацыі народных рамёстваў; праводзіць даследчую работу па выяўленню мясцовых і рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай народнай творчасці, накіраваную на адраджэнне ўнікальных тэхналогій паводле старадаўніх мясцовых узораў; стварае і забяспечвае працу творчых майстэрань па розных відах народных рамёстваў; арганізуе экскурсіі і сустрэчы з майстрамі народнай творчасці, семінары, выставы; вядзе супрацоўніцтва з замежнымі і міжнароднымі арганізацыямі, супрацоўнічае з прэсай, радыё, тэлебачаннем.

Імкненне падтрымаць аўтэнтычны фальклор у яго жывым бытаванні і натуральным асяроддзі суправаджаецца ў Беларусі і пошукамі новых, і падтрымкай ужо вядомых нетрадыцыйных форм бытавання і распаўсюджання традыцыйнай культуры, якая ўспрымаецца і грамадствам, і ўладай як неабходная ўмова развіцця сучаснай беларускай культуры.

У сістэме грамадскага і культурнага жыцця не толькі Беларусі, але і іншых усходнеславянскіх народаў выразна прасочваецца агульны аб'ядноўваючы стрыжань. Гэта свядомая, а яшчэ больш несвядомая генетычная арыентаванасць на каштоўнасці сваёй шматвяковай народнай культуры. У народнай культуры прадстаўлена цэласна-мастацкая канцэпцыя чалавека-этнафора ў яго разнастайных адносінах да сябе, да людзей, да прыроды і грамадства. І гэта не тэарэтычныя, а аксіялагічныя, духоўныя і эстэтычныя адносіны прыроднага і сацыяльнага існавання.

Унікальная з'ява сучаснай фалькларыстыкі — шматтомны (каля 50 кніг) збор «Беларуская народная творчасць», створаны на аснове спадчыны фалькларыстаў і сучаснага фальклорна-этна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

графічнага абследавання этнічных рэгіёнаў Беларусі. Зараз ажыццяўляецца шасцітомнае выданне «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» па рэгіёнах [6].

Адным са шляхоў актывізацыі дынамікі народнай культуры выступае распаўсюджванне народных культурных каштоўнасцей у сродках масавай інфармацыі (радыё, тэлебачанне, кіно, друк) і знаёмства, вывучэнне іх праз сістэму адукацыі, уключаючы ўстановы адукацыі ўсіх узроўняў.

Сведчаннем клопатаў аб развіцці традыцыйнай культуры з'яўляецца пастаянная ўвага нашага універсітэта. Толькі за апошнія гады ў сценах БДУ культуры і мастацтваў адбыліся тры (уключаючы гэтую) міжнародныя і міжвузаўскія канферэнцыі. Гэта, безумоўна, значная падзея.

Прыемна асэнсоўваць тую акалічнасць, што захаванне і развіццё традыцыйнай культуры ў нашай краіне высока ацэньваецца на міжнароднай арэне. Напрыклад, выступаючы на адкрыцці Тыдня беларускай культуры ў красавіку 2002 г. у Тэатры П'ера Кардэна ў Парыжы, Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Каіціра Мацууры сказаў: «Грунтуючыся на сваіх традыцыях, але рашуча звяртаючыся да будучыні, беларуская творчасць змагла шмат пачарпнуць у багатай разнастайнасці сваёй спадчыны, каб выказаць на сучаснай арыгінальнай мове ўласную душу сваёй культуры. Таму я шчаслівы, што ЮНЕСКА звязана з гэтай прэстыжнай з'явай».

ЛІТАРАТУРА


1. Беларуская культура сёння: Гадавыя агляд. 2003. Мн., 2004.
2. Гісторыка-культурная спадчына / Дзяржаўная праграма «Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года. Мн., 2002.
3. Михайлова Н. Г. Народная культура // Культуролгия XX век. Энциклопедия. Т.2. СПб., 1998.
4. Народная культура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік / Пад агульнай рэд. доктара гіст. навук, прафесара В. С. Цітова. Мн., 2002.
5. Скараходаў У. П. Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі. Мн., 2003.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе. Мн., 2001.



***Ihnatovich P. R.***

*TRADITIONAL CULTURE IN THE MODERN SOCIOCULTURAL PROCESS OF BELARUS*

*The author touches upon the place of traditional folk cultur in the modern siciocultural process, the problems of its preservation and revial.*


## БЕЛОРУССКАЯ НАУКА ОБ ИСКУССТВЕ: ТРАДИЦИИ И ИННОВАЦИИ


**Нечай О. Ф.,**
**ведущий научный сотрудник Института искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси, доктор искусствоведения**


Развитие белорусского искусствоведения в его традиционных формах самым тесным образом связано с подготовкой научных кадров высшей квалификации — докторов и кандидатов наук. В то же время в науке происходят инновационные процессы в связи с ориентацией гуманитарных исследований на практические результаты на основе новейших современных технологий. Защита диссертаций в Республике Беларусь происходит в специализированных советах: в ГНУ «Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси» — по четырем специальностям: 17.00.01 — театральное искусство; 17.00.03 — кино-, теле- и другие экранные искусства; 17.00.04 — изобразительное и декоративно-прикладное искусство; 17.00.06 — техническая эстетика и дизайн; в Белорусской государственной академии музыки — по одной специальности 17.00.02 — музыкальное искусство; в Белорусском государственном университете культуры и искусств — по двум специальностям: 17.00.09 — теория и история искусства; 24.00.01 — теория и история культуры (культурология).

Мне как председателю экспертного совета № 27 Высшей аттестационной комиссии Беларуси необходимо тщательно знакомиться со всеми искусствоведческими и культурологическими диссер-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ